**МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ РАЦЫЯНАЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ВУЧЭБНА-ВЫХАВАЎЧАГА ПРАЦЭСУ Ў ШКОЛАХ БЕЛАРУСІ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ**

**Болбас Г.У.**
УА МДПУ імя І.П. Шамякіна, г. Мазыр, Рэспубліка Беларусь

Адной з неабходных умоў рэалізацыі сучаснага адукацыйнага працэсу з’яўляецца яго рацыянальная арганізацыя. Гэта ў сваю чаргу абумовіла зварот педагагічнай грамадскасці да тэарэтычнага асэнсавання і выкарыстання шматлікіх навамодных педагагічных тэхналогій, якія дазваляюць алгарытмізаваць і аптымізаваць дзеянні суб'ектаў адукацыйнага працэсу, эфектыўна і нестандартна вырашаць канкрэтныя задачы выхавання і навучання. На жаль, не заўсёды педагагічная свядомасць сучаснага настаўніка накіравана на прачытанне шматвяковай педагагічнай спадчыны, якая заключае разам з каштоўнымі думкамі па пытаннях арганізацыі школьнай справы вопыт іх практычнай рэалізацыі.

Велізарны патэнцыял па асэнсаванні разглядаемых пытанняў заключае педагагічная тэорыя і практыка Беларусі эпохі Адраджэння (XV–XVII стст.). Гэты гістарычны перыяд характарызуецца культурным росквітам, дынамічнымі працэсамі развіцця адукацыі, інтэнсіўным ростам адукацыйных устаноў розных канфесій. Адной з найважнейшых педагагічных ідэй актыўна выступае павышэнне эфектыўнасці навучання. Ідэолаг пратэстантызму М. Лютэр знаходзіў рашэнне падобнай праблемы ў змястоўным насычэнні заняткаў і новых спосабах іх арганізацыі. Ён сцвярджаў, што «въ три года можно изучить более, чемъ прежде въ двадцать и тридцать лет…» [2, с. 94], і гэтая думка ўсяляк падтрымлівалася педагагічнымі калектывамі лютэранскіх школ на тэрыторыі Беларусі першай паловы XVI ст.

Адзначаючы важнасць арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, беларускія мысліцелі ставілі яе ў залежнасць ад прыроднага розуму асобы, прызнаючы яго найважнейшым інструментам пазнання. У школьнай практыцы дадзеная ідэя знайшла ўвасабленне ў формах дыферэнцыраванага навучання, якія дазваляюць навучаць выхаванцаў на ўзроўні іх магчымасцей і прыродных схільнасцей, з улікам асаблівасцей індывідуальнага пазнання. Напрыклад, калі са звычайнымі хлопцамі ў езуіцкіх школах праца на ўроку будавалася ў выглядзе спаборніцтваў, то для адораных арганізоўваліся акадэміі (навуковыя гурткі).

Таксама практычна па ўсіх вучэбных прадметах існавалі акадэміі, якія спрыялі больш глыбокаму вывучэнню той ці іншай дысцыпліны. Да таго ж, згодна з саксонскім вучэбным



МГПУ им. И.П. Шамякина

планам, на які абапіраліся педагогі канфесійных школ Беларусі, рэкамендавалася дзяліць дзяцей на групы, першая з якіх складалася з дзяцей, якія навучаюцца чытанню; другая – з дзяцей, якія ўмеюць чытаць і займаюцца граматыкай; трэцяя – «из самыхъ способныхъ» [5, с. 111–112]. Ідэі індывідуалізацыі навучання ўсяляк падтрымліваліся ідэолагамі пратэстантызму і каталіцызму. М. Лютэр выказваўся нават аб неабходнасці стварэння спецыяльных школ для «… тех детей, которые проявят способности, позволяющие надеяться, что из них выйдут высокообразованные люди…» [2, с. 110].

Разам з неабходнасцю выкарыстання ў педагагічным працэсе дыферэнцыраваных форм работы актыўна асэнсоўваліся магчымасці для прымянення ў школьнай практыцы прыёмаў так званага сёння інтэграванага навучання. Гэтыя падыходы пераважна былі абумоўлены імкненнем да гуманістычнага ідэалу «універсальнага чалавека» і ўяўленнямі аб інтэгратыўна-цэласнай прыродзе чалавека. Адзін з тытанаў эпохі Адраджэння Эразм Ратэрдамскі, на чые ідэі абапіраліся айчынныя асветнікі, лічыў важным, напрыклад, філолагу ведаць геаметрыю, арыфметыку, прыродазнаўства і іншае для таго, каб «понимать классиковъ всестороннимъ образомъ» [3, с. 308].

Інтэграваныя падыходы ў школьнай справе знайшлі рэалізацыю перш за ўсё ў вызначэнні зместу навучання. Прыкладам можа паслужыць той факт, што ў пратэстанцкіх школах пры вывучэнні баек Эзопа вучням прапаноўвалася ў першы дзень растлумачыць іх змест, потым праскланяць і праспрагаць, а потым, як сцвярджаюць даследчыкі, «когда поймутъ правила конструкціи, ихъ заставляютъ сочинять» [4, с. 97].

Больш за тое, ў пратэстанцкіх школах выкарыстоўвалі вопыт Штурма, які шырока ўжываў метады інтэграванага навучання, што дазваляла выходзіць за межы дысцыплінарных межаў і канцэнтраваць змест навучання не вакол навук, а вакол праблем. Прыватнай праявай такога падыходу стала вядзенне вучнямі слоўнікаў па рубрыках: «целое и части, дружба и вражда, причина и следствіе» і г. д. [5, с. 165]. Пераемнасць падобных ідэй у сучаснай педагагічнай навуцы мы знаходзім у тэорыі наасфернай адукацыі.

Асэнсаванне феномена дзяцінства ў эпоху Адраджэння ўмацавала разуменне залежнасці працэсу засваення ведаў ад узроставых асаблівасцей выхаванцаў. Гульня як асноўная форма спасціжэння дзіцем навакольнага свету стала абавязковым атрыбутам арганізацыі навучання. Так, у езуіцкіх адукацыйных установах выкарыстанне гульнёвых метадаў і прыёмаў навучання атрымала шырокае распаўсюджанне. Напрыклад, у пачатку навучальнага года настаўнік прапаноўваў навучэнцам класа заданні павышанай складанасці.

Тых, хто атрымліваў найвышэйшы бал, прызначалі дэкурыёнамі. У іх функцыі ўваходзіла дапамагаць настаўніку падчас урокаў пры праверцы пісьмовых работ, апытваць вучняў класа па раней пройдзеным матэрыяле і г. д. Правядзенне спаборніцтваў, канцэртацый (узаемаапытванне ў парах) спрыяла, з аднаго боку, інтэнсіфікацыі працэсу навучання, з другога – забяспечвала даступнасць, аналіз вучэбнай інфармацыі і творчы падыход да яе засваення.

Інтэнцыі эпохі Адраджэння на тэрыторыі Беларусі вызначылі разам з важнасцю зносін з Богам прыярытэт сацыяльнай актыўнасці чалавека. Такая змена каштоўнасных установак у адукацыйнай практыцы абумовіла неабходнасць дыялогавых метадаў навучання, якія прызнаваліся прыродным інструментарыем ўзаемадзеяння суб'ектаў адукацыйнага працэсу, рэсурсам актывізацыі рацыянальнай і эмацыянальна-валявой сфер асобы выхаванца. Характэрным і адным з самых эфектыўных у сістэме адукацыі для ўсіх класаў езуіцкіх школ стаў метад вуснага выкладання.

Больш за тое, дыялогавы характар навучання і выхавання знаходзіў працяг ва ўзаемадзеянні педагогаў і навучэнцаў у пазаўрочны час. Вядома, што прафесары па чарзе прысутнічалі на абедзе разам з навучэнцамі і вялі з імі размовы. Яны павінны былі «не безмолвствовать за едою, а напротивъ, всякій раз говорить что-нибудь, могущее служить для развития юношества» [5, с. 170]. З дапамогай такіх прыёмаў педагогі рэалізоўвалі сваё «стремленіе пріобрести доверіе ученика, сделаться его другомъ и не ограничиваться сухимъ до отвращенія обученіемъ…» [1, с. 432].

Вялікае значэнне для сучаснай адукацыйнай сістэмы мае практыка выкарыстання прыродазгодных прыёмаў навучання. Так, беларускі асветнік В. Цяпінскі, імкнучыся зрабіць свае выданні больш даступнымі для самага шырокага кола чытачоў, кожную старонку кнігі дзяліў на дзве калонкі, у адной з якіх даваў царкоўнаславянскі тэкст, у іншай – яго пераклад на беларускую мову. Пры гэтым на палі выносіліся незразумелыя словы і тлумачэнні да іх. Падобныя прыёмы выкарыстоўваюцца сучаснымі аўтарамі прыродазгодных методык навучання.

Такім чынам, пытанні рацыянальнай і эфектыўнай арганізацыі педагагічнага працэсу знаходзяць адлюстраванне ў гісторыка-педагагічнай спадчыне. Вопыт арганізацыі школьнай

МГПУ им. И.П.Шамякина

справы на тэрыторыі Беларусі эпохі Адраджэння прадэманстраваў магчымасці актывізацыі і аптымізацыі дзейнасці педагога і навучэнцаў з дапамогай розных падыходаў, метадаў і прыёмаў навучання.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Летурно, Ш. Эволюція воспитанія у различныхъ человеческихъ расъ / Ш. Летурно. – СПб.: Тип. т-ва «Нар. польза», 1900. – 499 с.

2. Лютер, М. Проповедь о том, что нужно посылать детей в школу / М. Лютер // Мартин Лютер – реформатор, проповедник, педагог / сост. О.В. Курило. – М.: Изд-во РОУ, 1996. – С. 118–154.

3. Очеркъ исторіи воспитанія и обученія съ древнейшихъ до нашихъ временъ: в 2 ч. / сост. Л. Модзалевскій. – СПб.: Тип. Ф. Сущинскаго, 1874. – Ч. 2. – 604 с.

4. Паротц, Ю. Всеобщая история педагогики для руководства учащимся в нормальных школах / Ю. Паротц. – СПб.: Тип. А.М. Котомина, 1875. – 386 с.

5. Шмидт, К. История педагогики / К. Шмидт. – М.: Типография Мартынова и К°, 1879. – 479 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина